# МАГІЛЯЎЧАНЕ — ЛЕПШЫЯ

**Студэнты Магілёўскага ўніверсітэта харчавання перамаглі ва ўсерасійскай студэнцкай алімпіядзе «Тэхналогія хімічных валокнаў і кампазіцыйных матэрыялаў на іх аснове».**

Алімпіяда праходзіла ў Санкт-Пецярбургу ў Дзяржаўным інстытуце тэхналогіі і дызайну. Магілёўскі універсітэт накіраваў на алімпіяду двух студэнтаў хіміка-тэхналагічнага факультэта. Абодва ўдзельнікі — Таццяна Гарноўская і Павел Чвіраў — занялі на алімпіядзе першыя месцы. А работа Паўла Чвірава атрымала рэкамендацыі журы алімпіяды як выдатны матэрыял для дысертацыі.

**Ілона ІВАНОВА.**